# АРХІЎНАЯ РЭФОРМА 1852 г.
# У ЗАХОДНІХ ГУБЕРНЯХ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

**В. С. Макарэвіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, MakareVS@bsu.by*

Разглядаюцца перадумовы, прычыны і наступствы правядзення архіўнай рэформы 1852 г. у заходніх губерніях Расійскай імперыі. Паказана, што з'ява фальсіфікацый і падлогаў дваранскіх дакументаў, надзвычай шырока распаўсюджаная у заходніх губернiях імперыі як вынік рэакцыі грамадства на палітыку «разбору шляхты», стала адной з галоўных прычын правядзення рэформы.

***Ключавыя словы:*** архіўная рэформа; фальсіфікацыі дваранскіх дакументаў; разбор шляхты; заходнія губерніі расійскай імперыі.

# АРХИВНАЯ РЕФОРМА 1852 г.
# В ЗАПАДНЫХ ГУБЕРНИЯХ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ

**В. С. Макаревич**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, MakareVS@bsu.by*

Рассматриваются предпосылки, причины и последствия проведения архивной реформы 1852 г. в западных губерниях Российской империи. Показано, что явление фальсификаций и подлогов дворянских документов, чрезвычайно широко распространенное в западных губерниях империи как результат реакции общества на политику «разбора шляхты», стало одной из главных причин проведения реформы.

***Ключевые слова:*** архивная реформа; фальсификации дворянских документов; разбор шляхты; западные губернии Российской империи.

# ARCHIVAL REFORM OF 1852
# IN THE WESTERN PROVINCES OF THE RUSSIAN EMPIRE

**V. S. Makarevich**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, MakareVS@bsu.by*

The article considers the prerequisites, reasons and consequences of the archival reform of 1852 in the western provinces of the Russian Empire. It is shown that the phenomenon of falsifications and forgeries of noble documents, extremely widespread in the western provinces of the Empire as a result of the public reaction to the policy of "sorting out the gentry (minor nobility — shliahta)", became one of the main reasons for the reform.

***Keywords:*** archival reform; falsification of noble documents; nobility sorting; western provinces of the Russian Empire.

З моманту падзелаў Рэчы Паспалітай і ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, адным з прыкметных напрамкаў унутранай палітыкі імперыі стала палітыка па верыфікацыі дваранскага паходжання дваран заходніх губерняў і пазбаўлення дваранскага статусу значнай колькасці дробнай шляхты. Падобная палітыка пачала рэалізоўвацца ўжо з часоў Кацярыны II, першапачаткова з не вельмі значным поспехам. На далучаных землях, у тым ліку ў беларускіх губернях, працэнт дваранства заставаўся вельмі значным у саслоўнай структуры насельніцтва. Такі стан рэчаў меў наступствам тое, што дзяржаўная казна страчвала нямалыя сумы з-за таго, што значна больш людзей, якія тут мелі статус дваран, не плацілі падаткі. Другім пацярпелым з’яўлялася расійскае войска, якое з-за той жа прычыны мела меней рэкрутаў, паколькі дваран не прыцягвалі да рэкруцкай службы. Палітыка верыфікацыі атрымала назву палітыкі «разбору шляхты». Найбольш кардынальным крокам у палітыцы «разбору шляхты» стаў указ ад 17 кастрычніка 1831 г., па якому шляхце заходніх губерняў выстаўляўся абмежаваны тэрмі на падачу архіўных дакументаў для доказу дваранскага паходжання сваіх радоў. Указ выклікаў выбух з’явы фальсіфікацыі дваранскіх дакументаў і метрык у заходніх губернях. Трэба адзначыць, што з’ява мела прыкметны характар і раней, але пасля ўказу набыла асаблівую вастрыню і пагражала нівеляваць ўсе намаганні ўладаў па «чыстцы» дваранскага салоўя далучаных тэрыторый.

Каб спыніць фальсіфікацыі, ўлады паспрабавалі ўзяць пад больш пільны кантроль выдачу копій архіўных дакументаў і выпісаў з актаў і метрык, а таксама працу дваранскіх дэпутацкіх сходаў, бо яны ажыццяўлялі верыфікацыю дваранскіх дакументаў на нізавым узроўні. З гэтымі мэтамі ствараліся камісіі па рэвізіі актавых і метрычных кніг у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях у 1834–1835 гг., камісіі па рэвізіі дзейнасці дваранскіх дэпутацкіх сходаў у 1834–1842 гг., разнастайныя лакальныя губернскія камісіі ў 1842–1852 гг., ў Вільні і Кіеве цэнтральныя рэвізійныя камісія, але значнага плёну ўсё адно не было. Дваранскія дакументы як фальсіфікаваліся, так і працягвалі фальсіфікавацца, што падрывала ініцыятывы ўладаў па радыкальным змяншэнні колькасці асобаў, якія карысталіся дваранскім статусам у заходніх губерніях імперыі [1, с. 112, 203].

Чарговым важным крокам улад, які, па задуме, павінен быў паўздзейнічаць радыкальна і раз і назаўжды спыніць фальсіфікацыі, была архіўная рэформа ў заходніх губернях імперыі. Справа была ў тым, што актавыя кнігі і метрыкі былі асноўнага тыпу дакументамі, выпісы з якіх і запісы ў якія падрабляліся. Захоўваліся гэтыя дакументы, калі казаць пра актавыя кнігі, у падсобных архівах прысутных месцаў, якіх былі дзясяткі, а метрыкі ў касцёлах і цэрквах. Усё гэта давала доступ да дакументаў значнай

колькасці мясцовых чыноўнікаў, якія пераўтварылі справу фальсіфікацыі дваранскіх дакуменгтаў у своеасаблівы від прыбытковага бізнесу. Каб супрацьдзейнічаць гэтаму ўлады вырашылі перавесці ўсе метрычныя кнігі ў тры вызначаныя месца і ўзяць іх пад больш пільны кантроль. Вынікам стала архіўная рэформа 1852 г. у заходніх губернях імперыі.

У 1852 г. былі створаны тры цэнтральныя архівы — у Віцебску, Вільні і Кіеве. Утвораныя архівы акумулявалі ў сваіх сховішчах усе актавыя кнігі і адначасова прымалі на сябе функцыі ранейшых рэвізійных камісій па праверцы актаў і выяўленні фальшывак. Менавіта таму ў 1852 г. рэвізійныя і часовыя следчыя камісіі спынілі сваё існаванне. У цэнтральныя архівы перадаваліся ўсе дакументы і актавыя кнігі, датаваныя перыядам да 1799 г. Тое, што да моманту стварэння архіваў гэтыя актавыя кнігі захоўваліся ў падсобных архівах розных устаноў, было таксама значнай нязручнасцю і ў працы рэвізійных камісій [2, с. 46]. На тое, што жаданне спыніць масавую фальсіфікацыю актавых дакументаў стала адной з галоўных прычын архіўнай рэформы ў заходніх губернях 1852 г. пісалі тагачасныя архівісты [3, с. 29; 4, с. 5]. На гэта ўказвае і сама назва ўказа, дзе ёсць словазлучэнне «*дваранскія роды*» — «Аб заснаванні ў Кіеве, Віцебску і Вільні цэнтральных архіваў для актавых кніг заходніх губерняў» з мэтай захавання важных у археалагічных адносінах дакументаў, якія складаюць «адзіныя ў сваім родзе матэрыялы для айчыннай гісторыі і старажытных дваранскіх родаў» [5, с. 120–121]. Архівы першапачаткова сталі значнай перашкодай фальсіфікатарам. Па словах загадчыка Віленскага архіва М. Гарбачэўскага, са 100 дакументаў, якія паступалі на пацвярджэнне ў архіў, законным аказваўся адзін [3, с. 5]. Здаецца, архіварыус перабольшваў, але, відаць, не быў ён і цалкам галаслоўны. З моманту адкрыцця цэнтральных архіваў толькі яны мелі права выдаваць выпісы з актаў. Для выдачы кожнага выпісу загадчык архіва павінен быў запрашаць некалькі асоб — павятовага старшыню дваранскага сходу, у Віцебску дырэктара гімназіі, а ў Вільні — старшыню камісіі для разбору і выдання старажытных актаў. Камісія звярала падрыхтаваны выпіс з актам і вызначала, прызнаецца ён несумнеўным ці наадварот. За выдачу выпісу бралася пошліна. Арыгіналы актавых кніг забаронена было выдаваць установам і прыватным асобам [6, с. 53–54]. Перадача архівам актавых кніг калі і паўплывала на змяншэнне з'явы фальсіфікацыі, але адначасова не выкараніла яе цалкам. У 1862 г. зноў з'явіліся звесткі пра масавыя фальсіфікацыі на далучаных тэрыторыях былога Вялікага Княства Літоўскага. У 1867 г. улады спынілі разгляд як у дваранскіх сходах, так і ў Герольдыі тых спраў, якія былі заснаваны на дакументах Кіеўскага цэнтральнага архіва, у сувязі з масавымі фальсіфікацыямі. Была зноў утворана камісія, ужо для пераправеркі

рашэнняў, прынятых на аснове дакументаў, што былі выдадзены гэтым архівам. Аднак камісія вымушана была прызнаць сваю некампетэнтнасць, бо «не магла вызначыць прымет, паводле якіх можна было б адрозніць сапраўдныя акты XVIII ст. ад падробленых» [6, с. 53–54].

Архіўная рэформа 1852 г. у заходніх губернях імперыі акрамя пэўнага абмежавання з'явы фальсікацыі дваранскіх дакументаў, што было адной з асноўных прычын яе правядзення, стала адначасова значнай падзеяй у станаўленні архівістыкі на тэрыторыі Беларусі і Украіны, паколькі архівы сталі адначасова асяродкамі навуковай апрацоўкі і выкарыстання дакументаў перыяду ВКЛ і Рэчы Паспалітай у даследчай дзейнасці, спрыяючы развіццю тьаксама і гістарычнай навукі у беларускіх губернях, і у цэлым у Расійскай імперыі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Макарэвіч В. С.* Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII–XIX ст.). Мінск : БДУ, 2018. 315 с.

2. *Каманин И.* Киевский центральный архив (1852–1880) // Сборник археологического института. Кн. 5, пол. 2. 1881. С. 45–56.

3. *Лялин В. А.* Виленский центральный архив // Сборник археологического института : в 6 кн. / под ред. Н. В. Калачова. СПб., 1878–1898. Кн. 1. 1878. С. 22–38.

4. *Самоквасов Д. Я.* Архивное дело в России : в 2 кн. Кн. 1 : Современное русское архивное настроение. Приложения. М., 1902.

5. Сборник материалов, относящихся до архивной части в России : в 2 т. Пг., 1916–1917. Т. 1. 1916.

6. *Самоквасов Д. Я.* Архивное дело в России. : в 2 кн. Кн. 2 : Прошедшая, настоящая и будущая постановка архивного дела в России. М., 1902.